## XXIII ГАРЭЦКІЯ ЧЫТАННІ «МАКСІМ І ГАЎРЫЛА ГАРЭЦКІЯ. ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ»

### МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

***(Мінск, 17 красавіка 2015 года)***

Канферэнцыя ладзілася ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры пры падтрымцы Рэспубліканскага фонду братоў Гарэцкіх і Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Форум прысвячаўся двум юбілеям: 115-годдзю нараджэння доктара геолага-мінералагічных навук Гаўрылы Гарэцкага і 95-годдзю першага выдання «Гісторыі беларускае літаратуры» Максіма Гарэцкага.

«Гісторыя беларускае літаратуры» М. Гарэцкага – знакавае для айчыннай навукі і педагагічнай практыкі выданне. Вытрымаўшы выпрабаванне часам, выкладзеная ў кнізе канцэпцыя гісторыі нацыянальнай слоўнасці прадвызначыла вектар пошукаў сучасных даследчыкаў. Падручнік падзяліў лёс аўтара: на шмат год ён быў выкрэслены з акадэмічнага ўжытку. Яго вяртанне да шырокага кола чытачоў адбылося толькі ў 1992 г.

На пачатку працы ўвазе ўдзельнікаў канферэнцыі быў прадстаўлены кароткаметражны фільм «Рускі» (2014), зняты В. Аслюком (кінастудыя «Беларусьфільм») па матывах аднайменнага апавядання М. Гарэцкага.

З уступным словам да ўдзельнікаў звярнуліся дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Л. Макарэвіч і акадэмік НАН Беларусі, доктар геолага-мінералагічных навук Р. Гарэцкі. Навукоўца прааналізаваў найбольш значныя дасягненні гарэцказнаўства за 2014 г. Асаблівая ўвага была звернута на пераклад аповесці М. Гарэцкага «Дзве душы» на нямецкую мову (здейснены Н. Рандау, Г. і У. Чэпега), які пабачыў свет у берлінскім выдавецтве «Гугольц». Кніга, безумоўна, спрыяе папулярызацыі спадчыны класіка айчыннай літаратуры за мяжой.

З прывітальным словам выступіў А. Вярцінскі.

Пленарнае паседжанне адкрылася дакладам Т. Тарасавай «Канцэпцыя пабудовы гісторыі беларускай літаратуры Максімам Гарэцкім». Адзначыўшы захады даследчыка ў станаўленні айчыннай навукі пра прыгожае пісьменства, Т. Тарасава разгледзела яго працу ў сувязі з пошукамі сусветнавядомых (перш за ўсё расійскіх) літаратуразнаўцаў-сучаснікаў. Гаворку пра навуковую спадчыну М. Гарэцкага працягнуў М. Мушынскі ў дакладзе «”Маладняк” за 5 гадоў: 1923–1928”: як подступ да “Гісторыі беларускае літаратуры” новага часу». Р. Гарэцкі («Гаўрыла Гарэцкі – выхавацель сыноў») расказаў пра багатую эпісталярную спадчыну бацькі, адрасаваную сынам, у якой выявілася педагагічная канцэпцыя Г. Гарэцкага. Р. Зінава прыгадала сваё падарожжа на малую радзіму братоў Гарэцкіх («На радзіме акадэміка Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага ў Малой (Меньшай) Багацькаўцы (да 115-годдзя з дня нараджэння)»). Цікавым падаецца даклад В. Губскай: даследчыца прааналізавала багаты навуковы матэрыял, назапашаны на старонках дваццаці двух зборнікаў матэрыялаў канферэнцыі («Па старонках Гарэцкіх чытанняў: спроба сістэматызацыі даследавання»).

Праца канферэнцыі працягнулася ў дзвюх секцыях. Прысутныя заслухалі даклады па праблемах сучаснага гарэцказнаўства: асновы сучаснай айчыннай літаратуразнаўчай тэрміналогіі, закладзеныя М. Гарэцкім; творчасць пісьменніка ў святле імагалогіі; рытарычная арганізацыя эпісталярнага дыскурсу Максіма і Леаніда Гарэцкіх; метадалогія Гарэцкага-публіцыста; спадчына празаіка ў сістэме твораў беларускіх пісьменнікаў пра Першую сусветную вайну; мастацкае асэнсаванне вобраза інтэлігента ў спадчыне айчыннага класіка; рарытэтныя выданні М. Гарэцкага і інш.

Канферэнцыя скончылася выступамі арганізатараў, якія падвялі вынікі працы і вызначылі перспектывы вывучэння спадчыны Гаўрылы і Максіма Гарэцкіх. Удзельнікі ўсклалі кветкі да помніка М. Гарэцкаму.

***З.І. Трацяк, кандыдат філалагічных навук***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***